АЛЯКСАНДР ГЕРЦЫК

# ПАЭТЫЧНЫ СВЕТ РЫГОРА БАРАДУЛІНА: УРОКІ Ў XI КЛАСЕ

З творчасцю паэта вучні сустракаліся ўжо неаднойчы (у 5 класе выучаўся верш “Бацьку”, у 7 – “Мы – беларусы…”, у 8 – “Трэба дома бываць часцей…”), таму іх уяўленні пра яго паэтычную творчасць трэба сістэматызаваць, паглыбіць і падагуліць. Менавіта да гэтага будзе скіравана дзейнасць пастаўніка на ўроках. Праграма адводзіць на выучэнне паэзіі Рыгора Барадуліна 2 гадзіны, і мы прапануем наступную сістэму работы:

**1-ы ўрок.** Жыццёвы і творчы шлях паэта. Вобразы роднай краіны ў яго творчасці. Патрыятычная лірыка. Тэма нацыянальнага адраджэння Беларусі.

**2-і ўрок.** Разнастайнасць творчых пошукаў. Філасофская і прыродаапісальная лірыка. Тэма кахання. Падрыхтоўка да эсэ”Мае адносіны да паэзіі Рыгора Барадуліна”.

Напярэдадні першага ўрока даем вучням апераджальныя заданні і тэмы індывідуальных паведамленняў: “Дзяцінства і юнацтва паэта”, “Пачатак паэтычнай дзейнасці”, “Этапы творчага сталення”, “Творчасць паэта на сучасным этапе”; адпаведныя матэрыялы вучні знойдуць у артыкуле В.І.Смыкоўскай [10].

**Першы ўрок** пачнем з вучнёўскіх паведамленняў пра творчы шлях паэта.

Потым арганізуем працу па аналітычным вывучэнні патрыятычнай лірыкі і тэмы роднага краю ў ёй. Вобраз роднай зямлі, роднай Беларусі атрымаў у паэзіі Рыгора Барадуліна пэўнае развіццё. Спачатку зямля для яго – эта своеасаблівая “малая” радзіма, прыкметы якой звязаны з родным хутарам Верасовачкай, старой хатай, падзеямі дзяцінства і юнацтва, першымі захапленнямі і перажываннямі. У гэтым плане сапраўды па-майстэрску напісаны верш **“Заспаная раніца мжыстая…”**, чытаем яго выразна і аналізуем:

*1.Паспрабуйце сваімі словамі сказаць аб тым настроі, які ў вас абуджаюць вершаваныя радкі. Наколькі супадаюць вашыя пачуцці з усім тым, што перажывае паэт?*

*2.Зрабіце спробу першаснай чытацкай рэфлексіі. Блізкі вам гэты верш ці, наадварот, далёкі?*

*3.Вызначыце, калі ласка, галоўную думку твора. Якая страфа раскрывае нам яе?*

*4.На якія дзве няроўныя часткі магчыма падзяліць верш? Чаму?*

*5.Як у іх мяняецца аўтарскі позірк?*

*6.Чаму апісанні восеньскай прыроды гармануюць са станам душы лірычнага героя?*

*7.Назавіце сродкі мастацка выразнасці, якія выкарыстаў Рыгор Барадулін. Якія, на ваш погляд, найбольш удалыя?*

Верш даносіць да нас сум паэта аб пакінутай роднай вёсцы, успаміны яшчэ не паспелі страціць сваёй вастрыні таму, што часу ад развітання прйшло яшчэ мала, і карціны вясковага жыцця паўстаюць вельмі яскрава:

І вёдры прыглушана бразгаюць
Каля адсырэлае студні,
Лісцёваю дыхае брагаю,
Пакутуе восень застудай [1, с.54].

Галоўная думка гучыць у апошніх радках верша, яна набывае метафарычнае значэнне:

І моцна жадаецца-верыцца,
Што ўсё да паўдня праясніцца [1, с.54].

Поўдзень – гэта не толькі вызначэнне часу, але і этап жыцця чалавека, які прыйдзе пасля раніцы жыця і сімвалізуе сталасць.

Верш падзяляецца па зместу на дзве няроўныя часткі, да першай магчыма аднесці тры страфы, а апошнюю, чацвёртую, – да другой. Першая частка – гэта разгорнутыя карціны ўспамінаў пра вясковае дзяцінства, яны прасякнуты замілаваннем перад хараством прыроды, другая частка – спроба філасофскага асэнсавання мінулага. Таму і аўтарскае бачанне ў іх неаднолькавае, ад карцін прыроды Барадулін пераходзіць да апісанняў стану душы лірычнага героя, але яны таксама пададзены ў межах прыроднай вобрзнасці:

Цвітуць успаміны верасам.
Няяснае мроіцца-сніцца [1, с.54].

У гэтым раннім вершы паэт паказвае мастацкае валоданне сродкамі мастацкай выразнасці, асабліва трэба адзначыць метафары і метафарычныя злучэнні, такія, як “лісцёваю дыхае брагаю, пакутуе восень застудай”; а трэцяя страфа ўвогуле з’яўляецца нпадзельным мастацкім адзінствам, у ёй спалучаюцца адухаўленні з метафарамі:

Цыбатай нагой жураўлінаю
Імшарамі верасень крочыць.
Ад кіслых прысмак журавінавых
Заплюшчыла сонца вочы [1, с.54].

Потым чытаем выразна верш **“Радзіме”** і аналізуем:

*1.Як вы лічыце, чаму паэт абраў для свайго верша форму звароту?*

*2.У вершы намаляваны партрэт роднай краны. З якіх рысаў ён складаецца?*

*3.Якія совы робяцца лейтматывам твора, паўтараюцца ад страфы да страфы?*

*4.Паэт ставіць знак роўнасці паміж маці і радзімай. Якой мастацкай мэты ён гэтым дасягае?*

*5.Якія радкі верша, на ваш погляд, гучаць найбольш пафасна?*

*6.Чаму спалучаюцца голас роднай краіны і купалаўскія радкі?*

*7.Якія сродкі мастацкай выразнасці выкарыстоўвае паэт? Як яны прыяюць эмацыйнаму ўздзеянню верша?*

У вершы паэта арганічна зліваюцца пачуцці да маці і да радзімы, ён не падзяляе іх для сябе і даносіць гэтую непадзельнасць да чытачоў. Таму і звяртаецца ён да радзімы нібыта да блізкага і роднага чалавека, нават імкнецца ў чымсьці дапамагчы ёй:

Дазволь падзяліць мне, пакуль жыву,
Турботаў тваіх хоць кроплю [1, с.63].

Верш пачынаецца з адмаўлення ўсяго салодкага і сусальнага, якое толькі перашкаджае ўспрыманню сыноўняга абавязку; Барадулін спалучае родную краіну і родную мову:

Матчынай мовы словам святым
Жывеш ты ў сыноўнім сэрцы [1, с.63].

Лейтматывам твора робяцца словы "маці" і "сын", а таксама розныя ўтварэнні ад іх, што дазваляе наблізіць дзяржўнае, агульнае, да родавага, сямейнага:

Братоў і сясцёр не кідала ў бядзе,
Грозная ў бітве і ў працы [1, с.63].

Апошнія два радкі заключнай страфы напісаны на вялікім эмацыйным уздыме, у іх гучыць матыў самаахвярнасці, які потым змяняецца матывам прымірэння і нейкай набытай гармоніі:

Сляпы да цябе дапаўзу да дня,
Намацаю сцежку рукамі,
Сосны спрадвечныя мне зазвіняць
Купалаўскімі радкамі..[1, с.63].

Імя Янкі Купалы з'яўляецца зусім невыпадкова: ён таксама сын сваёй зямлі, і Барадулін жадае падхапіць паэтычную эстафету ў свайго савутага папярэдніка.

Эмацыйнай напоўннасці твора спрыяюць і сродкі мастацкай выразнасці: Радзіму-маці характарызуе высокая пафасная лексіка – "матчына мова", "слова святое", "грозная ў бітве і ў працы". Паэт імкнецца падкрэсліць прыгажосць прыроды роднай краіны: "вецер хмеліць", "сосны спрадвечныя". Гэта дазваляе ўзмацніць эмацыйнае ўздзеянне верша.

Тэматычную блізкасць да верша "Радзіме" падкрэслівае ўжо назва наступнага твора – **"Я – сын зямлі"**. Задаем вучням наступня пытанні:

*1.У чым мастацкае падабенства гэтага верша і верша "Радзіме"?*

*2.А ў чым вы бачыце адрозненне мастацкага маштабу абодвух вершаў?*

*3.Чаму ад роднай краіны Барадулін накіроўвае свій позірк у космас, да "планет-сясцёр"?*

*4.Чаму напрыканцы верша ўзнікае вобраз дрэва? Як гэты вобраз перагукваецца з міфалагічнай традыцыяй?*

І ў гэтым вершы слова "сын" таксама з'яўляецца лейтматывам, толькі маштаб мастацкіх карцін істотна мяняецца, набывае касмічную неабсяжнасць:

Не спіць зямля –
у ёй вулканы дрэмлюць,

планеты-сёстры
пазыўныя шлюць [1, с.67].

Нагадаем, што верш быў напісаны на пачатку 60-х гг. ХХ ст., якраз тады адбываліся першыя палёты ў космас, амаль усе чакалі сустрэчы з дзівосамі сусвету, але Барадулін, тады зусім яшчэ малады, сваім творчым інстынктам адчуў, што чалавек – гаспадар не ў космасе, а на зямлі:

Ды толькі па зямлі
спрадвечны клопат,
як сэрца,
б’ецца ў кожнага ў грудзях [1, с.67].

Паэт атаесамлівае сябе з роднай зямлёй, выкарыстоўвае ў якасці сродка мастацкай выразнасці антрапаморфны прынцып, вядомы яшчэ з міфалагічных часоў:

Быў надта б рад,
каб хоць зярняткам дробным
змог на зямлі бацькоўскай
прарасці.
Яе вачмі
гляджу на свет сягоння:
слупы гудуць мне
соснамі ў бары [1, с.67].

Тут таксама ўзнікае вобраз родных сосна – характэнай прыкметы добра знаёмага, таго, што з’яўляецца асновай жыцця. А касмічны шлем нагадвае паэту пчалярскі каптур:

Не касманаўта бачу ў шлемафоне –
суседа
у пчалярскім каптуры [1, с.67].

Далей міфалагічная вобразнасць паглыбляецца, у заключных радках намаляваны вобраз дрэва як сімвала жыцця, нездарма ж яно расло побач з першымі людзьмі ў Эдэме:

Чым цягнецца вышэй
у неба дрэва –
глыбей
ідуць карэнні у зямлю [1, с.67].

Наступны тэматычна блізкі да папярэдніх верш мае назву **“Зямля”** і аналізуецца з дапамогай пытанняў:

*1.А ў чым своеасаблівасць успрымання паэтам роднай зямлі ў гэтым вершы? Чым яно адрозніваецца ад таго, якое прагучала ў “Радзіме”?*

*2.А чаму ў гэтым вершы так моцна гучаць пантэістычныя матывы? Як яны суадносяцца з яго назвай?*

*3.Як мяняецца лірычны маштаб вобраза зямлі ў вершы?*

*4.Чаму паэт пераходзіць ад вялікіх, касмічных вобразаў да больш дробных?*

*5.Ахарактарызуйце сродкі мастацкай выразнасці ў гэтым вершы . Што для іх уласціва?*

У вершы "Зямля" перад намі паўстае яе партрэт ужо ў новай якасці, зямля – як маці ўсяго існуючага, у тым ліку і самога паэта, як увасабленне магутных сіл прыроды:

Ты павядзеш плячом – шчабечуць вёсны,
Другім – завеі капыцяць загон [1, с.132].

Зямля ўяўляецца паэтам як магутная жывая істота, заснавальніца прыродных стыхій, і паэт адчувае сябе часцінай яе:

Хай будзе на лугах тваіх відзён,
Дыміць не аддыміцца след мой росны [1, с.132].

Своеасаблівы пантэізм Рыгора Барадуліна праяўляецца ў ягоным спакланенні перад гэтай жывой зямлёй, якая – маці не толькі яго, але і ўсіх астатніх землякоў паэта, таму і шырокі беларускі прасор здаецца паэту падобным на стол у хаце, за якім збіраецца вяткаваць ураджай уся радня:

Абрусам руні маладой здавён
Заслана ты, як круглы стол шырозны, –
Для ўсіх павінен быць не цесным ён! [1, с.132].

Апошні радок адрасаваны ўжо не толькі землякам-беларусам, але і ўсім жыхарам планеты Зямля.

І завершыць працу на першым уроку зварот да верша **"Неруш"**, у якім патрыятычная тэматыка спалучаецца з быццём роднай мовы:

*1.Прасачыце рух лірычнага сюжэту. Чаму спачатку паэт кажа пра "роднае слова", а напрыканцы верша – пра "матчына слова"?*

*2.Дзе лірычны герой шукае "роднае слова"?*

*3.Чаму Барадулі спалучае прыродную вобразнасць з грамадзянскім пафасам?*

*4.У чым ён бачыць прызначэнне сапраўднага паэта?*

Назва верша стала адначасова і назвай паэтычнага зборніка, які выйшаў у далёкім 1966 годзе, але актуальнасць мастацкіх радкоў не страчана і сёння. Паэт вельмі заклапочаны лёсам беларускай мовы, "роднага слова", якое ўпершыню пачуў з матчыных вуснаў. Таму і лірычны сюжэт пабудаваны як асэнсаванне лёсу "матчынага слова" і адначасова прызначэння паэта:

Ад абразы, ад позірку злога,
Шлях заблытаўшы для наслання,
Неруш ранішні –
матчына слова,
Мне, як бору,
цябе засланіць! [1, с.137].

Мілагучнае слова паэт шукае ў прыгожым прыродным свеце, пад "зялёным крылом верасовак", сярод "спякоты і дажджу", яно аздоблена промнямі сонца, таму Барадулін спалучае прыродную вобразнасць з грамадзянскім пафасам, што надае асаблівую эмацыйную выразнасць вершаваным радкам:

А пашчасціць – натрапіцца неруш, –
Зазвіняць недзе промні наўзбоч.
Неруш свой панясу я аберуч,

Як слязіну з матуліных воч [1, с.137].

Вельмі ўдалая назва твора, яна раскрывае яго галоўную думку: неруш – гэта непадзельнае адзінства роднай мовы, беларускай прыроды, чалавечых пачуццяў і прызначэння паэта, у вершы Барадуліна адно дапаўняе другое, а мастацкае слова найлепшым чынам адлюстроўвае гэтую непадзельнасць.

**Падагульняльныя пытанні** да ўсяго першага ўрока: *як звязана гістарычнае мінулае нашай краіны з яе адраджэннем у творчасці Рыгора Барадуліна?Як спалучае паэт прыроднае і грамадскае?Якія з прааналізаваных вершаў спадабаліся вам больш за астатнія? Чаму?*

**Другі ўрок** праводзім як даследчы семінар: клас падзяляем на тры групы, кожная з іх рыхтуе аналітычныя паведамленні па асобных тэмах лірыкі. Такая форма працы дазволіць ахапіць больш шырокае кола вершаў паэта, суаднесці творы, якія неабходна вывучыць згодна школьнай праграме з тэмтычнымі кантэкстамі лірычнай творчасці.

**Першая група разглядае філасофскую лірыку паэта.** Выразна чытаецца вершы **“Вечнасць”, “А я быў у вясны палонны…”, “Не па барадзе – па чарадзе…”** і потым даследуюцца з дапамогай пытанняў настаўніка.

Пытанні да верша “Вечнасць”:

*1.Як паэт будуе свой дыялог з Вечнасцю?*

*2.Як у ягоных думках спалучаецца касмічнае і зямное?*

*3.Чаму ён падкрэслівае сваю чалавечую годнсць і непаўторнасць?*

*4.З дапамогай якіх мастацкіх сродкаў ён гэта робіць?*

Пытанні да аналізу верша “А быў я ў вясны палонны…”:

*1.Які настрой у героя верша?*

*2.Аб чым ён шкадуе?*

*3.Што за словы з’яўляюцца лейтатывам верша?*

*4.Якую ацэнку магчыма даць жыццю лірычнага героя?*

Пытанні да верша “Не па барадзе – па чарадзе…”:

*1.У чым праяўляецца таямнічасць смерці?*

*2.Чаму смерць заўсёды сумленная і справядлівая?*

*3.Які сэнс чалавечаму жыццю яна надае?*

*4.Чаму каштоўнасці, якімі захапляюцца людзі, для яе нічога не азначаюць?*

Філасофская паэзія Рыгора Барадуліна – глыбокая і змястоўная. Верш “Вечнасць” пачынаецца аптымістычна, малады паэт упэўнены, што ягонае жыццё будзе шчаслівым, яго душа цягнецца да сонца і адштурхоўвае змрок. Аўтару крыху больш за трыццаць на момант стварэння верша, на двары – ліберальная эпоха 60-х гадоў, якая яшчэ не паспела трансфармавацца ў застой, таму ён упэўнены ў дабрыні навакольнага свету. Нават будучая старасць не палохае паэта, ён бачыць сваю старую пасівелую галаву падобнай на зямны шар, а маршчыны на твары нагадваюць яму мерыдыяны на глобусе:

Бор галавы маёй аснежыш ты

І ўладна пакладзеш на лоб круты
Зямныя, ўпартыя мерыдыяны, –
Мяне не ўстрашыць захад залаты [1,с.110].

Уласны шлях паэт уяўляе як прамежак паміж “ясным сонцам” раніцы жыцця і “залатым захадам” яго скону. Тое, што чалавек – толькі часовы госць на зямлі, таксам не палохае аўтара, ён лічыць, што пакіне пасля сябе штосьці значнае і непаўторнае:

Не знікну так, як цень, як гук пусты.
Не адцвітуць вачэй маіх паляны…[1, с.110].

У апошнім з працытаваных радкоў Барадулін ужывае вельмі прыгожую і паэтычную метафару, якая сведчыць аб высокім узроўні майстэрства паэта: “вачэй маіх паляны”. Не меншае ўражанне пакідаюцы іншыя метафары і метафарчныя выразы: “зязюлямі гадоў”, “бор галавы”, “захад залаты”, “думак караваны”. У сваіх метафарах Барадулін выкарыстоўвае зямную, прыродную сэнсавую грань, таму метафарычныя сродкі надаюць вершу, у якім гаворыцца пра вечнае, непадуладнае часу, падкрэслена зямны, жыццясцвярджальны характар.

Тэматычна блізкі верш “А быў я ў вясны палонны…” створаны амаль праз восем гадоў пасля “Вечнасці” і ўвайшоў у зборнік “Рум” (1974). У ім паэт смуткуе аб страчаным аптымізме маладосці і параўноўвае сталасць душы саракагадовага чалавека з зялёным лістом дрэва на пачатку восені; знешне лірычны герой выглядае яшчэ маладым, але душя яго стамілася, яна ўжо не ўспрымае навакольны свет так, як гэта было ў юнацтве:

Раскручваюцца рулоны
Грамоў, навальнічных вясёлак.
Як восеньскі ліст, я зялёны,
Але не такі вясёлы [1, с.245].

Апошнія два вершаваных радка з’яўляюцца лейтматывам твора, яны нязначна вар’іруюца ад страфы да страфы; такое паўтарэнне зноў і зноў падкрэслівае расчараванасць лірычнага героя і яго душэўную стомленасць.

Яшчэ большым песімізмам прасякнуты верш “Не па барадзе – па чарадзе…”, лірычныя радкі сугучныя прозвішчу яго аўтара – Барадулін. Паэт разважае тут аб смерці як таямнічым фінале зямного жыцця, а першая страфа падкрэслівае неспадзяванасць яе прыходу:

Смерць ідзе
Таксама, як сустрэчы.
Хай бы ты
У невядомым дзе
Першаму даверыла мне плечы [1, с.252].

Паэт сцвярджае, што жыццё як з’ява - несумленнае і неспрвядлівае, у пагоні за чымсьці часовым і матэрыяльным чалавек часта ахвяруе духоўным дзеля карысці і сам пакутуе ад гэтага:

Ад цябе б я
Не пачуў абраз,
Ад цябе б я

Не зазнаў знявагі,
Залаты запас свой цэніць час, –
Дробязі
Ён не кладзе на вагі [1, с.252].

А смерць заўсёды справядлівая і непадкупная, бо за ўсе скарбы свету немагчыма купіць лішняе імгненне жыцця, смерць прыходзіць і да бедных, і да багатых, і да загнаных і да маючых уладу, а таму ўсе чалавечыя каштоўнасці робяцца чымсьці зусім не абсалютным:

Мы сябе не ведаем саміх,
Мы мінулы дзень
Хваліць ахвочы [1, с.252].

І толькі перажытае калісь каханне мімаволі кранае чалавечае сэрца на скону яго зямнога жыцця:

Помню,
Днелі вочы…
…Па-дзявочы…[1, с.252].

Сённяшняя паэзія Рыгора Барадуліна складаная і разнастайная, роздум пра чалавека, прыроду, Сусвет спалучаецца са шчодрым смавыяўленнем мастака.

Філасофскія разважанні паэта ўрэшце-рэшт прывялі яго да рэлігійна-хрысціянская высновы жыцця. Апошні яго паэтычны зборнік мае назву "Ксты", у ім пераасэнсаваны матывы з кнігі Эклезіяста, прытчаў Саламонавых і іншых тэкстаў Ветхага і Новага Запаветаў.

**Другая група** ў сваіх даследаваннях звернецца менавіта да гэтай тэматыкі. Пытанні да верша **"Божа, паспагадай усім…"**:

*1.Чым нагадвае гэты твор хрысціянскія малітвы? Знайдзіце і пракаментуйце найбольш характэрныя ўласцівасці.*

*2.Звярніце ўвагу на першую страфу. Чаму паэт пабудаваў яе па прынцыпу кантраста?*

*3.Некаторыя звароты да Бога паўтараюць вядомыя тэзісы хрысціянскай маралі, а некаторыя скіраваны да нашага часу. Дыферэнцыруйце іх.*

*4.Якія заклікі паэта здаюцца вам найбольш актуальнымі?*

Пытанні да верша **"У вуснаў ёсць дамова з языком…"**:

*1.У чым паэт бачыць дыялектыку нараджэння слова?*

*2.Чаму душа – галоўная ў нараджэнні слова? Аргументуйце свой адказ.*

*3.Як вы зразумелі фразу: "Душа. Яна й твая табе чужая."? Паспрачайцеся, выкажыце вае думкі наконт гэтага тэзісу.*

*4.У чым галоўная думка гэтага верша? Перакажыце яе сваімі словамі.*

*5.Нагадаем вядомы тэзіс расійскага паэта-філосафа Ф.І.Цютчава: "Мысль изреченная есть ложь". Як вы лічыце: Барадулін абвяргае гэты тэзіс ці пацвярджае яго?*

Пытанні да верша **"Досыць!"**:

*1.Які настрой пануе ў творы? Чаго ў ім болей - аптымізму ці песімізму?*

*2.Падрабязна, радок за радком, пракаментуйце першую страфу. Як мяняе яе сэнс кожнае новае слова?*

*3.Якія словазлучэнні ў гэтай страфе гучаць парадаксальна? Па якім мастацкім прынцыпе яны пабудаваны?*

*4.У чым ідэя гэтага верша?*

*5.Як характарызуе паэт чалавечае жыццё і душу? Ці згодны вы з ім?*

*6.Чым апраўданы песімізм Рыгора Барадуліна? Параўнайце галоўную думку гэтага верша з прытчай, якую расказаў Мармеладаў Радзіёну Раскольнікаву ў рамане Ф.Дастаеўскага "Злачынства і пакаранне". Чым блізкія верш і прытча?*

Па сваёй мастацкай форме верш "Божа, паспагадай усім…" нагдвае хрысціянскю малітву, паколькі на пачатку і ад страфы да страфы паўтараюцца звароты да Бога:

Божа, паспагадай усім,
Каб вайной не йшоў
Брат на брата,
Каб ржавела сякера ў ката,
Каб вячэраю пахнуў дым [2, с.161].

Першая страфа – гэта своеасаблівае набыццё гармоніі ў супярэчлівым і бязлітасным свеце, толькі прынцыпы хрысціянскай любові да Бога і да ўсіх навакольных людзей – сваіх братоў у Хрысце – дазволяць сучаснаму грамадству, якое падзелена на палітычныя партыі і эканамічныя групоўкі, набыць страчаную паўнату быцця:

Божа, паспагадай усім –
І магутнаму, і слабому,
І відушчаму, і сляпому,
Каб у згодзе жылося ім [2, с.161].

Звароты да Бога спалучаюць у сабе як адвечную недасканаласць чалавечае прыроды, так і заклапочанасць паэта сучасным станам грамадства; аўтар выкарыстоўвае такія паэтычныя выразы, як "цяплелі пагляды людскія", " нічыіх не кралі радзім", апошняя ж страфа верша цалкам скіравана да сучаснасці.

Верш "У вуснаў ёсць дамова з языком…" уяўляе сабой паэтычную інтэрпрэтацыю 72-га псалма Давідава. Асноўны аўтарскі тэзіс сфармуляваны ў першай страфе з дапамогай вельмі змястоўных лірычных вобразаў, якія кантрастуюць паміж сабой:

У вуснаў ёсць дамова з языком.
Пра гэта змоўчыць цішыня нямая.
Язык трымацца мусіць пад замком,
А неспасціжны ключ душа трымае [2, с.86].

Барадулін разгортвае перад намі дыялектыку нараджэння думкі, на ягоны погляд, розум нараджае думку, маральнасць якой правяраецца душой чалавека, душа кантралюе і розум, і чалавечыя выказванні:

Бо вусны – вусце думкі,
Што сама

На выйсце просіць у душы дазволу [2, с.86].

Найбольш парадаксальныя разважанні паэта наконт прыроды чалавечае душы:

Душа – гняздоўе
Прыцемку й святла,
Хто ўзважыць,
Што ў душы пераважае?
Не раз палону тлен перажыла
Душа.
Яна й твая табе чужая [2, с.86].

Паэт у гэтай страфе мае на ўвазе незалежнасць душы, я ўнутраную свабоду, у чалавечай душы непадуладна гучыць голас сумлення, калі чалавек дзеля якой-нбудзь выгоды робіць амаральныя ўчынкі, душа раз-пораз вяртае яго да гуманізму і духоўнасці.

Яшчэ адзін аспект – гэта той, што душа з'яўляецца Боскім стварэннем, яна ствараецца асобна ад цела, і на заканчэнні зямнога быцця зноў вяртаецца да свайго Стваральніка на суд, дзе на падставе зямных учынкаў яе накіроўваюць у рай або пекла.

Гэтая ідэя з'яўляецца апірышчам для галоўнай думкі твора: чалавек адказвае за свае ўчынкі, язык і мова дадзеныя яму, каб ён казаў праўду, а не валачыў іх як "пугу пастухову" сярод жыццёвых дробязей і меркантыльных памкненняў.

Да гэтай самай тэмы – несуадноснасці думкі і слова – звяртаўся таксама расійскі паэт XIX ст. Ф.І.Цютчаў, які перасцерагаў чытачоў ад скажэння думак з дапамогай языка. І ў гэтым сэнсе абодва паэты ў сваіх вершах вельмі блізкія, яны заклікаюць людзей да праўдзівасці перш за ўсё перад сабою, а потым – перад усімі астатнімі.

Трэці з разгледжаных вершаў – "Досыць!" – па сваёй галоўнай думцы вельмі блізкі да папярэдняга. Тут паэт схіляецца да глыбокага песімізму, які выкліканы недарэчнасцямі зямнога быцця чалавека, якому наканавана ісці жыццёвым шляхам ад нараджэння да смерці:

Першым крыкам гэты свет вітаем
і на той маўкліва адыходзім.
Нам здаецца, што за небакраем
Смутак незямносцю залагодзім [2, с.239].

Наканаванасць чалавечага лёсу раскрываецца ўжо ў першай страфе: чалавек здольны да рэфлексіі наконт сваіх паводзін, бо ўнутраны рэгулятар асобы – сумленне – не дае ёй супакоіцца, таму і праходзяць у глыбінях душы розныя "ўспаміны".

Далей паэт уводзіць вельмі змястоўную метафару: "жыццё – салодкая гаркота", але ніяк яе не тлумачыць, таму чытачу самастойна трэба суаднесці яе глыбінны сэнс з уласным жыццёвым вопытам. Жыццёвая "гаркота" здольна прынесці асалоду, гэта – абодва бакі чалавечага існавання, адзінага і непадзельнага ў сваёй глыбіннай сутнсці, толькі чалавечы розум надае ім выгляд асалоды ці гаркоты.

Не менш значны метафарычны вобраз “беспрытуьнай самоты”. Аэнсаванне адноснасці жыццёвых памкненняў робіць іх сумніўнымі ў вачах паэта, адсюль настрой беспрытульнасці, нейкага глыбіннага жалю, якімі поўніцца верш.

Абедзве метафары пабудаваны на катрастах, сэнсавых супрацьпастаўленнях. Але ў той жа час утвараецца і своеасаблівы паэтычны сінтэз супрацьлеглых паняццяў, які адлюстроўвае дыялектычнасць зямнога быцця.

Галоўная думка верша выказана ў яго чацвёртай страфе, якая перагукваецца з назвай твора: асэнсаваная чалавекам уласная грахоўнасць не дазволіць яму далучыцца да Царства Нябеснага:

Мы – чаўны надзей і дамавіны,
Нам з грахамі мулка размінуцца.
Толькі немаўлячы сон нявінны
Зможа да нябёсаў дакрануцца [2, с.239].

Верш па тэматыцы вельмі блізкі рэлігійна-філасофскім пошукам Ф.М.Дастаеўскага, але ў сваёй галоўнай думцы Рыгор Барадулін куды больш бескампрамісны за расійскага пісьменніка. Дастаеўскі даваў у “Злачынстве і пакаранні” шанс на адраджэнне чалавеку, нездарма ж Мармеладаў расказвае Раскольнікаву прытчу, якой няма ў кананічным Евангеллі. Вуснамі героя тут кажа сам пісьменнік па вялікую сілу пакаяння: “Потому их приемлю, премудрые, потому приемлю, разумные, что ни единый из сих сам не считал себя достойным сего…” [7, с.60 – 61]. Барадулінскі вывад значна больш катэгарычны і бескампрамісны: толькі нявінныя дзеці ўвайдуць у Царства Нябеснае.

**Трэцяя група ў сваіх даследаваннях звяртаецца да тэмы кахання.** Пытанні да верша **“Чакаю міг спакою…”**:

*1.Як паэтызуе Р.Барадулін сустрэчу закахных?*

*2.Чаму мастацкія вобразы нагадваюць карцінкі ў калейдаскопе?*

*3.Як разгортваецца лірычны сюжэт?*

*4.Ахарактарызуйце сродкі мастацкай выразнасці. Якія з іх выкарыстаны паэтам часцей за ўсё?*

*5.Звярніце ўвагу на паэтычны сінтаксіс вершы. Чаму ў ім толькі два выказнікі?*

*6.Якога мастацкага эфекту дазваляюць дасягнуць паўторы слоў?*

*7.Давайце параўнаем барадулінскі верш з вядомым творам расійскага паэта А.Фета “Шепот, робкое дыханье…”. У чым вы бачыце падабенства іх вобразнай і мастацка-выразнай сістэм?*

Пытанні да верша **“Першага снегу мяккі змрок…”**:

*1.У чым падобная вобразная сістэма гэтага верша на вобразную сістэму папярэдняга?*

*2.Як спалучаюцца ў ім карціны прыроды і чалавечыя пачуцці?*

Пытанні да верша **“Спакой з лугоў плыве ў раку…”**:

*1.Якім пачуццем прасякнуты гэты верш?*

*2.Што за карціну намаляваў паэт у першай страфе?*

*3.Чаму адбываеца пераход ад карціна прыроды да чалавечых пачуццяў? Наколькі ён матывіраваны?*

*4.А чаму трэцяя страфа зноў вяртае нас да карцін прыроды?*

*5. У чым быў паэт падобным на таго юнака, які цяпер на ягоных вачах чакае дзяўчыну?*

“Чаканы міг спакою…” – адзін з самых пранікнёных вершаў паэта пра каханне. Пачынаецца ён вельмі дынамічна, адна лірычная карціна мяняе сабой другую, але ўсе яны прасякнты прадчуваннем шчасця. Паэт наўмысна пазбягае разгорнутых апісанняў, аналітычнага разляду пачуцця, ён перадае ліхманку кахання, у вершы чаргуюцца характэрныя вобразы нібыта калейдаскапічныя мініяцюры:

Чаканы міг спакою.
І паварот ключа.
Світае у пакоі
Ад смуглага пляча [1, с.184].

Барадулін апісвае пачатак спаткання закаханых і яго фінал, калі мужчына і жанчына развітваюцца. Таму і лірычны сюжэт рухаецца вельмі хутка, спачатку “світае у пакоі ад смуглага пляча”, а потым “нырае ў сон таропка маладзічок пляча”.

Асноўным сродкам мастацкай выразнасці робяцца паўторы слоў, у прыватнасці, эпітэтаў, што дазваляе выдзелць і падкрэсліць трывогу закаханага юнака:

Трывожнага дыхання
Трывожны сухавей,
Трывожныя ў тумане
Пагляды ласкавей…[1, с.184].

Верш пабудаваны па прынцыпе кальцавой кампазіцыі, ён пачынаецца і заканчваецца амаль аднолькава. Калейдаскапічнасць мастацкіх карцін, якія вельмі хутка мяняюцца, прыводзіць да таго, шо аўтар карыстаецца няпоўнымі сказамі, таму й невыпадкова, што ў вершы толькі два выказнікі.

Па сваёй мастацкай форме верш Рыгора Барадуліна шмат у чым нагадвае твор славутага расійскага паэта XIX ст. Афанасія Фета “Шёпот, робкое дыханье”: там і там адбываецца хуткая змена мастацкіх карцін, якія перадаюць дынаміку пачуцця; абдва вершы пабудаваны па прынцыпу кальцавой кампазіцыі, у абодвух амаль што няма выказнікаў, абодва характарызуюцца мастацкай дасканаласцю.

Такая ж вобразная сістэма характэрна і для верша “Першага снегу…”, лірычныя мініяцюры змяняюць адна адну, трэба зазначыць, што Барадулін праводзіць тут мастацкую паралель паміж карцінамі прыроды і чалавечымі пачуццямі:

Лесу маўклівасць,
Цнатлівасць гурб.
Губ сарамлівасць,
Гарачых губ [1, с.193].

Паэт карыстаецца таксама і прыёмам унутранага, сэнсавага кантрасту: холад снегавых гурб супрацьстаіць гарачыні губ.

Больш разнастайная вобразная сістэма характэрна для верша "Спакой з лугоў плыве ў раку…". У ім спалучаюцца самыя разнастайныя пачуцці: і спакой восеньскага вечару, і знаёмая ўжо па папярэдіх вершах трывога кахання, і светлая туга па тым часе, які адыйшоў у мінулае, і ўспаміны лірычнага героя пра сваё каханне, якое таксама згубілася недзе там далёка…

Першая страфа апісвае надыход восені і тыя пачуцці, якія абуджаюцца ў сэрцы героя пад яго ўплывам, таму паэт спалучае прыроднае з чалавечым, шырока карыстаецца мастацкім прыёмам увасаблення:

Спакой з лугоў плыве ў раку.
Вятрыста на адкосіне.
Самотна слухаць скверыку
Глухія крокі восені [1, с.226].

Гэта надае вершу амаль язычніцкі настрой, ліпы ў паэта "міргюць зялёнымі павекамі", дэталь партрэта гераіні нагадвае птушку – "мільгне касынкі ластаўка".

Лірычны сюжэт заснаваны на паслядоўным чаргаванні ўспамінаў пра мінулае і суадносінасці яго з цяперашнім часам. Лірычны герой смуткуе, што юнацтва засталося ўжо за плячыма:

Хіба не ўчора вечарам,
Ад радасці нямеючы,
Шаптаў табе спрадвечнае
і цалаваў няўмеючы?.. [1, с.226].

Паэт прводзіць паралель паміж сабой і тым незнаёмым юнаком, які чакае сваю дзяўчыну і хвалюецца ад няўпэўненасці. Смутак паэта жыццясцвярджальны, розумам ён асэнсоўвае, што мінулага не вернеш, але карціна чужога спаткання зноў вяртае ягоныя думкі да непаўторнага юнацтва…

Напрыканцы ўрока настаўнік падводзіць вынікі працы кожнай даследчай групы і задае **дамашняе заданне**, якое неабходна абгаварыць загадзя таму, што вучні павіны самастойна напісаць эсэ аб уласных адносінах да паэзіі Рыгора Барадуліна. Засяродзім іх увагу на тым, што эсэ як варыянт творчай работы павінна спалучаць у сабе мастацкае і аналітычнае. Юнакі і дзяўчаты распавядаюць аб тым, што выклікае ў іх цікавасць, здзіўленне, з якімі лірычнымі сцвярджэннямі паэта яны пагаджаюцца, з якімі – не, з чым хацелася б ім паспрачацца. Эсэ – гэта рэальная магчымасць выказаць свае ўласныя думкі наконт спасціжэння паэтычнага свету Рыгора Барадуліна. Магчыма ў якасці ўзора прапанаваць пазнаёміцца з эсэ аднаго з сучасных пісьменнікаў.

Літаратура

1. Барадулін, Р. Свята пчалы: Выбраныя вершы і паэмы/ Р.Барадулін. – Мн.: Маст. літ., 1975.
2. Барадулін, Р. Ксты: 3-е да. Выд./ Р.Барадулін. – Мн.: Рым.-Катал. парафія св. Сымона і св.Алены, 2009.

3. Астраух, А. “Долі інакшай не трэба зямной…”: Нататкі пра паэзію Рыгора Барадуліна/ А.Астраух// Роднае слова. – 2000. - №12. – С.15 – 18.
4. Бельскі, А.І. Творчасць Рыгора Барадуліна ў IX класе і на ўроках па сучаснай беларускай паэзіі / А.І.Бельскі// Беларуская мова і літаратура. – 2000. - №1. – С.19 – 32.
5. Гарэлік, Л. Паўстагоддзя на ніве беларускай паэзіі: светлы геній Рыгора Барадуліна/ Л.Гарэлік// Роднае слова. – 2010. - №2. – С.5 – 8.
6. Гніламёдаў, У. Усё жывое: Развагі пра паэзію Р.Барадуліна/ У.Гніламёдаў// Роднае слова. – 1999. - №4. – С.6 – 17.
7. Достоевский, Ф.М. Преступление и наказание. Роман в шести частях с эпилогом/ Ф.М.Достоевский. – Мн.: Беларусь, 1969.
8. Масейчык, А.А. Вернасць вытокам: Вывучэнне твораў Рыгора Барадуліна ў IX класе/ А.А.Масейчык// Беларуская мова і літаратура. – 1999. - №1. – С.73 – 78.
9. Сабуць, А.Э. Творчась Рыгора Барадуліна ў школьна праграме (XI клас)/ А.Э.Сабуць// Беларуская мова і літаратура. – 2009. - №11. – С.47 – 51.
10. Смыкоўская, В.І. “А песня не носіць ярма…”: Вывучэнне жыццёвага і творчага шляху Рыгора Барадуліна/ В.І.Смыкоўская// Роднае слова. – 1999. - №3. – С.140 – 147;№4. – С.85 – 94.